ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1985
19
СНЕЖНЯ
ЧАЦВЕР
№ 35 (1485)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

## Беларускі універсітэт ТЭЛЕТАЙП

*УЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА*

### СЁННЯ

ў актавай зале праходзіць навуковая канферэнцыя «Рэвалюцыя 1905—1907 гг.— першая народная рэвалюцыя эпохі імперыялізму». З уступным словам выступіць рэктар універсітэта акадэмік АН БССР Л. І. Кісялеўскі. З дакладамі выступяць прафесары У. К. Коршук, І. В. Аржахоўскі, А. П. Ігнаценка, К. К. Герман, П. П. Дронь.

А. СЛІЎНЯ.

### УРУЧАНЫ ДЫПЛОМЫ

народных калектываў на творчым вечары-сустрэчы з хорам народнай песні выкладчыкаў і супрацоўнікаў (хормайстар Н. Пачакоўская) і фальклорна-этнаграфічным ансамблем «Неруш» (кіраўнік В. Жабуртовіч). Калектывы выступілі з канцэртам перад прысутнымі.

М. ТАРАСАВА,
мастацкі кіраўнік студклуба.

### БЮРО ПАРТКОМА

разгледзела пытанні «Аб рабоце кафедраў грамадскіх навук па фарміраванню ў студэнтаў высокай палітычнай і маральнай культуры» (дакладвала А. М. Гурко) і «Аб рабоце партгруп кафедраў механіка-матэматычнага факультэта па ўдасканаленню навучання і выхавання студэнтаў» (дакладвалі М. В. Рожын, У. В. Амелькін).

У. САТОЛІН.

### ТАВАРЫСТВА «ВЕДЫ»

арганізавала ва універсітэце публічную лекцыю на тэму «Золата і валютна-фінансавыя праблемы ў сучасным свеце» з цыкла «Свет сёння». Чытаў лекцыю доктар эканамічных навук прафесар А. В. Анікін (г. Масква). Лектар адказаў на шматлікія пытанні слухачоў.

М. НАДЭР, Н. КАЗЕМ,
студэнты факультэта журналістыкі.

### У АБМЕРКАВАННІ ПРАЕКТА

Асноўных напрамкаў эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1986—1990 гады і на перыяд да 2000 года, якое дэманстравалася па рэспубліканскаму тэлебачанню, прыняў удзел актыў геаграфічнага факультэта. Сваімі думкамі аб праекце падзяліліся і ўнеслі канкрэтныя прапановы прафесар М. Т. Раманоўскі, дэкан факультэта Р. А. Жмойдзяк, дацэнт Г. І. Марцынкевіч.

Унесеныя прапановы датычылі праблем дзейнасці вышэйшай школы, навуковых даследаванняў і аховы прыроды.

Актыўны ўдзел у арганізацыі і правядзенні тэлевізійнай перадачы прыняў дацэнт Г. Я. Рылюк.

В. ЯЦУХНА,
сакратар партбюро геафака.

### ЛЕКЦЫЮ

для студэнтаў, якія вывучаюць французскую мову, правёў доктар філалагічных навук прафесар У. В. Макараў. Яна суправаджалася дэманстрацыяй слайдаў, зробленых лектарам у Францыі.

Ж. ДРОНСКАЯ.
дацэнт кафедры замежных моў.

## РАЎНЕННЕ — НА ПРАВАФЛАНГОВЫХ!



*ВАЛЕРЫЙ МАРЦІШОНАК не аднойчы прымаў удзел ва Усесаюзнай студэнцкай алімпіядзе па хіміі. Але толькі ў 1985 годзе ён стаў пераможцам. І можна ўпэўнена сказаць — заслужана. Таму што навука для Валерыя, студэнта І курса вытворчага патоку хімічнага факультэта — гэта не мара, не захапленне, а — жыццё.*

*У дэканаце мне падказалі, што знайсці Валерыя лягчэй за ўсё ў лабараторыі арганічнага сінтэзу. Там я і ўбачыў крыху разгубленага юнака ў працоўным халаце. На пытанне «Чаму стаў пераможцам алімпіяды?» Валерый лаканічна адказаў: «Прыйшоў ва універсітэт, каб вучыцца, а не за дыпломам».*

*У гэтым годзе В. Марцішонак стаў ленінскім стыпендыятам.*

*Фота і тэкст А. ВАЛОШЫНА.*

# Шчодрасць вашага сэрца

## ТЫДЗЕНЬ ДОНАРА

НАДЗВЫЧАЙ шматлюдна было ў канцы лістапада ў студэнцкай паліклініцы. У гэтыя дні ва універсітэце праходзіў тыдзень донара.

Аб людзях, якія даюць сваю кроў, адгукаюцца з павагай. Донар — гэта не прафесія і не пасада. Так называюць людзей, якія па асабістаму жаданню даюць сваю кроў для хворых, ратуючы ім жыццё. Многія, каго напаткала ў жыцці бяда, з удзячнасцю ўспамінаюць донараў, тых, хто ў цяжкую хвіліну заўсёды імкнецца дапамагчы людзям.

З просьбай расказаць аб гэтай высакароднай справе я звярнуўся да старшыні таварыства Чырвонага Крыжа універсітэта кандыдата медыцынскіх навук Л. А. Фралова:

— Нам вельмі прыемна, што колькасць донараў пастаянна павялічваецца. Так, у 1984 годзе на тысячу чалавек у нас было 213 донараў, у 1985 годзе іх стала 288. Прывяду яшчэ адну лічбу. Па вышэйшых навучальных установах рэспублікі на тысячу чалавек у сярэднім прыходзіцца 360 донараў. У гэтых адносінах у нас яшчэ шмат работы.

— Якія вынікі прайшоўшага тыдня донара?

— 1247 чалавек пабывалі ў гэтыя дні на донарскім пункце. Хочацца падзякаваць актывістам на факультэтах, якія праводзяць вялікую растлумачальную работу сярод сваіх калектываў. На біялагічным факультэце за гэту работу адказны выкладчык Б. Ф. Осіпаў, на юрыдычным — выкладчык А. А. Сакалова, на факультэце прыкладной матэматыкі — выкладчык Г. А. Расолька. Вельмі сур'ёзна ставяцца да донарства на гістарычным факультэце. Там усёй работай кіруе дэканат і партыйнае бюро. Мы з вялікай павагай адносімся да студэнтаў-донараў. Тыя, хто здаў кроў больш чым пяць разоў, узнагароджваюцца значком «Донар СССР» І, ІІ, ІІІ ступені. За прайшоўшы тыдзень ва універсітэце было ўзнагароджана 183 чалавекі. Сярод іх А. Мадамінаў, студэнт ІІ курса, А. Гмырак, студэнтка V курса. Асаблівай падзякі заслугоўваюць студэнт І курса геафака А. Кучук, які здаваў кроў 30 разоў, і студэнтка IV курса журфака Л. Некрашэвіч, якая здала кроў 14 разоў.

Неабходна ўлічваць, што справа гэта добраахвотная. Людзі прыходзяць па асабістаму жаданню. Трэба заахвочваць донараў. У ліку першых прадастаўляць месцы ў інтэрнаце, узнагароджваць пуцёўкамі ў санаторыі, прафілакторыі, улічваць донарства пры размеркаванні стыпендыі. Гэта пакуль што ў нас практыкуецца не на ўсіх факультэтах.

Аддаваць часцінку сябе на карысць другім гуманна і патрыятычна. Людзі прыходзяць на донарскі пункт, і гэта прыемна бачыць. Хочацца сказаць усім, хто наведаў у гэтыя дні пункты здачы крыві, сардэчнае дзякуй!

Запісаў А. МАКСІМАЎ,
студэнт журфака.

# ДОЎГА БУДЗЕ КАРЭЛІЯ СНІЦЦА

## АДРАСЫ РАМАНТЫКІ

У АПОШНЯЕ лета пяцігодкі Лоухскі занальны атрад працаваў пад кіраўніцтвам Аляксандра Нікіценкі. Дзесяць гадоў назад Саша ўпершыню апрануў будатрадаўскую форму, і з той пары амаль кожнае лета будатрадаўская штармоўка—яго верная спадарожніца. Дзесяць гадоў аддадзены будатрадаўскаму руху. За гэты час пройдзены шлях ад байца лінейнага атрада да камандзіра занальнага штаба. Часцінка Сашынай працы засталася на будоўлях Казахстана, Алтая, Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі...

У 1978 годзе ён упершыню прыехаў у саставе занальнага штаба на карэльскую зямлю. Не думаў ён тады, якія праўдзівыя радкі вядомай песні: «Долго будет Карелия сниться...». Хто хоць раз пабываў у гэтым цудоўным і суровым краі, не зможа забыць яго ніколі.

Чацвёрты працоўны семестр на карэльскай зямлі... Пасёлак Лоухі рос і маладзеў на вачах. Многія новабудоўлі раёна — як жывая памяць аб мінулых працоўных семестрах, гэтыя ж дамы ўзведзены студэнцкімі рукамі. Адказная работа была даручана камандзіру. Занальны атрад агульнай колькасцю 550 чалавек працаваў на будоўлях пяці раёнаў рэспублікі. І вельмі часта ўзнікалі то ў адным, то ў другім атрадзе праблемы, якія патрабавалі аператыўнага рашэння. Тэлефон занальнага штаба адказваў кругласутачна. Вось раздаецца тэлефонны званок, а ўжо цераз хвіліну сіні «уазік» вязе камандзіра: значыць, некаму хутка патрэбна дапамога, нехта аказаўся ў цяжкім становішчы. А дарога доўгая, за адзін аб'езд атрадаў спідометр нашага аўтамабіля «накручвае» больш дзвюх тысяч кіламетраў. Атрады раскіданы ад Ледмозера да Чупы. Здаралася, нават машына не вытрымлівала такога напружнага рытму работы, і пасля кожнага аб'езду два-тры дні вадзіцель рамантаваў яе.

У занальным атрадзе аўтарытэт камандзіра незвычайна высокі. На будаўнічай пляцоўцы Саша — заўсёды чалавек жаданы: ён у дасканаласці валодае ўсімі будаўнічымі спецыяльнасцямі. Не ў кожным атрадзе знойдзецца муляр, які зможа падужацца з ім. Як правільна арганізаваць работу, як знайсці агульную мову з арганізацыяй — гэтыя пытанні не застаюцца без адказу. І ў кожным выпадку багаты вопыт камандзіра, прафесійныя будаўнічыя веды, прыродная кемлівасць дапамагалі знайсці аптымальнае рашэнне. А з Днём будаўніка усе мы віншавалі Сашу як з яго прафесійным святам.

Для членаў штаба Саша не толькі калега і камандзір, ён выдатны таварыш. Мы заўсёды адчувалі яго падтрымку, дапамогу. Ён аптыміст і жыццялюб. З агеньчыкам і задорам ён бярэцца за любую справу, і ўсё гарыць у яго руках — ад афармлення штаба да прыгатавання абеду. А якая смачная юшка, звараная ім у рэдкія мінуты адпачынку на беразе ляснога возера!

У Белдзяржуніверсітэце імя У. І. Леніна добра ведаюць Аляксандра Нікіценку. Ён вядзе вялікую грамадскую работу: на працягу шэрагу гадоў з'яўляецца намеснікам сакратара камітэта камсамола універсітэта па навуковай рабоце. А яго будатрадаўская біяграфія, мабыць, адна з самых багатых ва універсітэце ды, бадай, і ў рэспубліцы. Саша ўзнагароджаны ганаровым знакам ЦК ВЛКСМ «За актыўную работу ў студэнцкіх атрадах». Сярод усіх узнагарод самай дарагой для яго стала Ганаровая грамата Савета Міністраў Карэльскай АССР.

Если я гореть не буду?
Если мы гореть не будем?
Кто ж тогда развеет тьму?

Калі я чытаю гэтыя радкі Назыма Хікмета, мне так і здаецца, што напісаны яны аб нашым камандзіру.

Гэта быў чацвёрты Сашын працоўны семестр на будоўлях Карэліі. Апошні ён?

В. МАЛАФЕЕЎ,
камісар Лоухскага
занальнага атрада-85.

## ПАДРЫХТОЎКА НАСТАЎНІКАЎ

# ЗВЯРАЦЦА ПА ШКОЛЬНАМУ МЕРЫДЫЯНУ

**Разам з усім калектывам універсітэта філалагічны факультэт бачыць сваю галоўную задачу ва ўдасканаленні падрыхтоўкі спецыялістаў. Наш факультэт рыхтуе ў асноўным настаўнікаў, таму пытанні школьнай рэформы для нас асабліва актуальныя. Справа, зразумела, не ў тым, каб увесці нейкія новыя спецыяльныя курсы або павялічыць час на некаторыя дысцыпліны. Справа заключаецца ў тым, каб інтэнсіфікаваць увесь вучэбны працэс, накіраваць яго на падрыхтоўку студэнтаў да будучай працы ў школе. Справа не ў вымуштроўванні студэнта па раздзелах, якія вывучаюць у школе, а ў тым, каб навучыць студэнта мысліць, рашаць практычныя задачы, якія перад ім паставіць жыццё. Яшчэ не напісаны тыя творы літаратуры, якія цяперашні студэнт будзе тлумачыць сваім вучням у 2000 годзе, яшчэ не ўсталі тыя праблемы камп'ютэрнай лінгвістыкі, без вырашэння якіх будзе немагчымым захаванне і пошук інфармацыі праз 30 гадоў. І наша задача — падрыхтаваць студэнта да самастойнага вырашэння гэтых праблем.**

МЫ РЫХТУЕМ НАСТАЎНІКАЎ. Гэта наш галоўны ўклад у школьную рэформу. Але тут мы сутыкаемся з некаторымі складанасцямі. Мы яшчэ не змаглі паставіць вучэбна-выхаваўчы працэс так, каб нашы выпускнікі гарэлі жаданнем ехаць у аддаленыя вясковыя школы. Але спроба вырашыць гэтую праблему цераз абыход конкурсу, праз прыём большасці абітурыентаў па розных накіраваннях і ільготах — таксама не рашэнне. У нас цяпер нямала прынята студэнтаў з круглай тройкай на ўступных экзаменах. Сядзяць яны перада мной у аўдыторыі і не слухаюць лекцыі. Апасля, як вынік, прыходзіць студэнтка для пераздачы экзамена ў трэці раз. Не будзе яна тым ферментам інтэлігентнасці, які так патрэбен нашай школе. Дарэчы, мы не ўпэўнены таксама, ці паедзе яна дадому. А калі і паедзе пасля вучобы на «здавальняюча», ці вялікая будзе ад яе карысць?

На факультэце назапасіўся некаторы вопыт працы са студэнтамі, якія займаюцца без адрыву ад вытворчасці. Падрыхтаваны таксама некаторыя спецыяльныя дапаможнікі для іх. Аднак тут нас стрымліваюць слабыя магчымасці аператыўнага выдання дапаможнікаў сродкамі малой паліграфіі.

Трое з падрыхтаваных мной кандыдатаў навук — былыя вячэрнікі. Значыцца, якасць падрыхтоўкі — нядрэнная. Але чамусьці МінВНУ і магчыма Дзяржплан, якія ў многіх справах ідуць нам насустрач, тут занялі пазіцыю, што накіравана на закрыццё гэтага канала падрыхтоўкі спецыялістаў. Спачатку закрылі прыём на вячэрняе беларускае аддзяленне, цяпер і на рускае. Пакуль мы не змаглі пераканаць у неабходнасці вячэрняга аддзялення. Дрэнна, напэўна, даказвалі.

Ва універсітэце працуе 12 доктараў навук — мовазнаўцаў. Гэта больш, чым у любой іншай установе, у тым ліку і ў акадэмічным інстытуце. Працуе таксама 5 доктараў навук — літаратуразнаўцаў. Толькі за апошнія тры гады выдана вучонымі філфака 30 падручнікаў і дапаможнікаў з грыфамі міністэрстваў. Аднак у павышэнні кваліфікацыі настаўніцтва наш патэнцыял пакуль удзельнічае недастаткова. Прафесары прачытваюць па адной-дзве лекцыі для настаўнікаў. Трэба яшчэ раз падумаць аб арганізацыі на нашай базе якога-небудзь цэнтра па павышэнню кваліфікацыі і адначасова па стажыроўцы настаўнікаў. Пакуль стажыроўка існуе толькі на паперы. Не прадугледжаны гадзіны і сродкі для рэальнага кіраўніцтва нашымі выпускнікамі на працягу 1—2 гадоў, у той час як гэта кіраўніцтва з'яўляецца неабходным. Рана ці позна педагогам прыйдзецца пайсці па шляху медыкаў, у якіх першы год практычнай работы рэгламентаваны як сапраўдная стажыроўка.

Наш факультэт, здаецца, адзіны ва універсітэце, які расце ў колькасных адносінах. Ужо 4 гады запар мы прымаем на 50—75 чалавек больш, чым выпускаем. Настаўнікі патрэбны. Мы маем усе кадры для іх падрыхтоўкі. Але прыходзіцца цяжка без памяшканняў. На стацыянары ў нас вучыцца 1250 студэнтаў. Гэта 53 акадэмічныя групы. На завочным і вячэрнім аддзяленнях вучыцца яшчэ каля 1000 студэнтаў. Каля сотні нашых навучэнцаў — гэта студэнты і стажоры, якія прыехалі з ГДР, Індыі, Кітая, Малі, Мадагаскара, Конга, Шры-Ланка, Марока, Ірака, Афганістана і іншых краін. Яны патрабуюць асаблівай увагі, маленькіх груп. А аўдыторый у нашым корпусе толькі 26, улічваючы так званыя кафедры і кабінеты. Вучэбная плошча 1550 кв. метраў. Вось таму і атрымоўваецца, што разам са сваім стажорам з паўгадзіны хаджу, шукаю месца для кансультацыі, а экзамен у тых, хто мае запазычанасць ці здае датэрмінова, прымаю ў калідоры, балазе там зараз крэслы паставілі. Упэўнены, што на філфаку склалася самае цяжкае становішча з памяшканнямі. Ёсць розныя прапановы на гэты конт. Відавочна адно: трэба шукаць нейкае выйсце. Займацца становіцца проста немагчыма.

Пры гэтым трэба ўлічваць і тое, што наш факультэт у некаторых адносінах асабліва прадстаўнічы. Справа не толькі ў тым, што ў нас займаюцца пасланцы двух дзесяткаў краін. Справа і ў тым, што іменна па нашаму факультэту мяркуюць аб адносінах да роднай мовы і літаратуры. Многіх нашых замежных студэнтаў і калег цікавіць беларуская мова і літаратура. Гэта адно з дасягненняў ленінскай нацыянальнай палітыкі нашай партыі, узняўшай беларускі народ, яго культуру на такую вышыню. Тыя ці іншыя формы супрацоўніцтва па пытаннях беларускай мовы і літаратуры маюцца ў нас з прадстаўнікамі ўсіх славянскіх краін, што ўсталі на шлях будаўніцтва сацыялізму: Балгарыі і Польшчы, Чэхаславакіі і Югаславіі. Супрацоўнічаем мы і з ГДР.

У Берліне і Сафіі па некалькі гадоў нашы лектары выкладалі беларускую мову. У чатырох заходнегерманскіх універсітэтах летась папрасілі мяне паўтарыць лекцыю аб мове Кірыла Тураўскага. Далучэнне беларускага матэрыялу да сусветнага філалагічнага звароту з'яўляецца адной з актуальных задач нашай навукі. Беларуская філалогія вызваляецца ад правінцыялізму — ворага ўсякай навукі. Трэба адзначыць, што замежныя славяне з вялікай увагай ставяцца да нас. Ужо некалькі гадоў працуюць на нашай кафедры лектары з Югаславіі і Балгарыі. Знакам увагі да нашай навукі і вышэйшай школы з'явілася тое, што сёлета да нас накіраваны з НРБ лектар у рангу прафесара.

Выхад з беларускім моўным і літаратурным матэрыялам на міжнародную арэну мае вялікае ідэалагічнае значэнне. Гэта і ўдар па рэакцыйных эмігрантах, якія гамзаюць аб спадзе нашай культуры, гэта і паказчык росквіту нашых культур для многіх замежных чытачоў і слухачоў, гэта і прыклад для краін, якія развіваюцца, якія шукаюць шляхі вырашэння складаных нацыянальных, моўных ці культурных праблем, гэта і ўклад у сацыялістычную інтэграцыю культур. У сувязі з гэтым хацелася б адзначыць, што выдавецтвы «Вышэйшая школа» і «Універсітэцкае» вядуць вялікую работу з мэтай папулярызацыі нашых дасягненняў. Аднак хацелася б, каб такіх выданняў было больш. Відаць, часта заніжаюцца тыражы нашых выданняў. А таксама вельмі хочацца, каб кнігагандлёвыя арганізацыі бачылі ў выданнях па пытаннях культуры і мовы, літаратуры сапраўдную каштоўнасць і прапагандавалі іх.

**А. СУПРУН,**
**загадчык кафедры агульнага і славянскага мовазнаўства, прафесар.**

## ПРАЕКТЫ ЦК КПСС: СТРАТЭГІЯ І ТАКТЫКА ПАСКАРЭННЯ

**У перыяд усенароднага абмеркавання партыйных дакументаў варта звярнуць увагу на іх гуманістычны змест, пранікнёнасць клопатам аб чалавеку, захаванні міру і жыцця на Зямлі. Сярод важнейшых праблем сучаснасці асаблівае месца займае экалагічная праблема. Пытанні аховы навакольнага асяроддзя былі заўсёды ў цэнтры ўвагі палітыкі КПСС і Савецкай дзяржавы. У новай рэдакцыі Праграмы КПСС падкрэсліваецца экалагічная арыентацыя навукова-тэхнічнага прагрэсу, экалагізацыя сучасных навуковых ведаў, самога працэсу выхавання асобы.**

# І словам, і справай

## ЭКАЛАГІЧНАЕ ВЫХАВАННЕ

ЭКАЛАГІЧНАЕ выхаванне накіравана на фарміраванне ў савецкіх людзей адпаведнай свядомасці, культуры, беражлівых адносін да прыроды, да ўсяго жывога, глыбокага разумення законаў прыроды. Гэтыя задачы ў многім вырашаюцца ў перыяд падрыхтоўкі спецыялістаў з універсітэцкай адукацыяй.

На геаграфічным факультэце назапашаны багаты вопыт экалагічнага выхавання студэнтаў. Тут пытанні адукацыі і выхавання вырашаюцца не толькі ў працэсе выкладання спецыяльных дысцыплін, але і грамадскіх навук, асабліва марксісцка-ленінскай філасофіі, якая выступае метадалагічнай асновай вырашэння праблем узаемадзеяння грамадства і прыроды, усёй сістэмы экалагічнага выхавання і адукацыі.

У выкладанні курсаў дыялектычнага і гістарычнага матэрыялізму, ва ўсёй ідэалагічнай рабоце на факультэце выкладчыкі шырока выкарыстоўваюць вынікі сваіх навуковых даследаванняў па экалагічнай праблеме, дасягненні ўсяго комплексу прыродазнаўчых і гуманітарных навук, арганізуюць шырокі ўдзел студэнтаў у навукова-даследчай рабоце па экалагічнай праблематыцы. Ужо стала шматгадовай традыцыяй падрыхтоўка дакладаў і выступленняў студэнтаў геаграфічнага факультэта па прыродаахоўных тэмах на семінарскіх занятках, студэнцкіх навуковых канферэнцыях, перад вучнямі школ, насельніцтвам. Амаль 80 працэнтаў студэнтаў прымаюць актыўны ўдзел у такой дзейнасці.

Напрыклад, на навуковай студэнцкай канферэнцыі, якая адбылася сёлета, аднымі з лепшых былі работы студэнтаў М. Жукавай «Беражлівыя адносіны да прыроды як маральная патрэба савецкага чалавека», В. Ляхава «Крытыка геапалітыкі, неамальтузіянства як рэакцыйных дактрын імперыялізму», В. Сечка «Узрастаючая роля геаграфіі ў навукова-тэхнічным прагрэсе», С. Галабурды «Галоўныя напрамкі рэсурсазахоўваючай палітыкі КПСС і Савецкай дзяржавы», І. Казбярук «Праблемы экалагічнага выхавання вучняў».

Дэканат і партыйнае бюро геаграфічнага факультэта надаюць вялікую ўвагу фарміраванню навуковага светапогляду студэнтаў. Так, пад кіраўніцтвам В. А. Барушка гэтае пытанне глыбока вывучаецца і рыхтуецца да абмеркавання на партыйным сходзе факультэта.

Выкладчыкамі і студэнтамі падрыхтавана вельмі шмат актуальных і цікавых лекцый па праблемах экалагічнага выхавання, прыродаахоўнай тэматыцы. Думаецца, што партыйнаму камітэту і камітэту камсамола універсітэта варта больш глыбока зацікавіцца гэтай тэматыкай і магчымасцямі больш шырокай прапаганды экалагічных і прыродаахоўных ведаў сярод насельніцтва.

**П. КАРАКА, Э. КЛЕСАВА,**
**дацэнты кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі прыродазнаўчых факультэтаў.**

# Лічым неабходным...

## РАДКІ З ПРАПАНОЎ

**А. ГАЛАЎКО, загадчык кафедры дзяржаўнага права і савецкага будаўніцтва, прафесар:**

У раздзеле IV, частцы другой указаць на ўмацаванне адзінства ўсіх элементаў палітычнай сістэмы, умацаванне законнасці, навуковай абгрунтаванасці планавання.

**С. ДРАБЯЗКА, загадчык кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, прафесар:**

У частцы другой, раздзеле IV, абзац восьмы пасля слоў «КПСС імкнецца садзейнічаць таму, каб Вярхоўны Савет СССР і Вярхоўныя Саветы саюзных рэспублік» дадаць словы «і аўтаномных рэспублік».

Там жа, абзац дзевяты, выраз «у дзейнасці Саветаў любога ўзроўню» замяніць словамі «у дзейнасці Саветаў усіх узроўняў».

**Л. МАКСІМАВА, дацэнт кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў:**

У частцы другой, раздзеле III палажэнне аб тым, што кожная сям'я да 2000 года будзе мець асобную кватэру, мэтазгодна змясціць у Асноўных напрамках эканамічнага і сацыяльнага развіцця на 1986—1990 гады і на перыяд да 2000 года.

**Я. ТАГУНОЎ, дацэнт кафедры дзяржаўнага права і савецкага будаўніцтва:**

У частцы другой, раздзеле IV пры пераліку элементаў палітычнай сістэмы сказаць і аб органах грамадскай самадзейнасці насельніцтва.

Варта даць больш грунтоўную характарыстыку агульнанароднай дзяржавы і сказаць аб гістарычных лёсах сацыялістычнай дзяржаўнасці, як гэта мае месца ў Праграме КПСС, што дзейнічае цяпер.

Варта было б адзначыць, што ўдасканаленне працы савецкага дзяржаўнага апарату магчыма толькі на аснове няўхільнага ўкаранення ленінскага стылю.

Неабходна ўказаць, што такое бюракратызм, якія асноўныя формы яго праяўлення і што трэба рабіць, каб яго перамагчы.

Патрэбна запісаць палажэнне аб тым, што ананімныя пісьмы не будуць разглядацца ні на якім узроўні.

**М. ЮРКЕВІЧ, загадчык кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права, прафесар:**

У другой частцы, раздзеле III замест слоў «сям'я іграе ўсё больш важную ролю» запісаць «сям'я павінна іграць усё больш важную ролю» і далей па тэксту.

## СІГНАЛЫ АПАВЯШЧЭННЯ

У НОВЫМ вучэбным годзе па грамадзянскай абароне усе супрацоўнікі універсітэта пачынаюць вывучэнне першай тэмы і сігналаў апавяшчэння ГА.

Трэба ведаць чатыры сігналы апавяшчэння ГА:

1. «Паветраная трывога».
2. «Адбой паветранай трывогі».
3. «Радыяцыйная небяспека».
4. «Хімічная трывога».

Сігналы падаюцца для ўсяго насельніцтва з выкарыстаннем тэхнічных сродкаў сувязі і аўтаматызаваных сістэм. Па гэтых сігналах заняткі ва універсітэце тэрмінова спыняюцца. Студэнты, выкладчыкі ўкрываюцца ў абаронных збудаваннях. Кожны павінен ведаць месца і час заняцця ўкрыцця. Ва ўсіх выпадках знаходжання ў негерметызаваных абаронных будынках неабходна надзець процівагаз.

Пры наяўнасці радыяцыйнай небяспекі не забудзьце прыняць сродак № 1 з індывідуальнай аптэчкі.

Звяртаю ўвагу кіраўнікоў заняткаў на практычнае вывучэнне кожнага сігналу.

Пры выкананні сігналаў апавяшчэння ГА будзьце ўважлівы і строга выконвайце распараджэнні органаў грамадзянскай абароны.

**Л. МЕЛЬНІКАЎ.**
**начальнік штаба ГА універсітэта.**

## ВУЧОБА — ГАЛОЎНАЯ ПРАЦА СТУДЭНТА



*ПРЫКМЕТЫ блізкай сесіі становяцца ўсё ярчэй. Мноства студэнтаў праводзіць свой пазаўрочны час у чытальнай зале бібліятэкі.*

*Жанна Мікульская, студэнтка IV групы II курса ФПМ сёння прыйшла ў бібліятэку, каб падрыхтавацца да семінара па гісторыі КПСС. Добрымі памочнікамі ёй сталі падшыўкі рэспубліканскіх і саюзных газет. Жанна лічыць, што студэнты, якія знаходзяць час на бібліятэку, на самаадукацыю, маюць усе падставы вучыцца на «выдатна».*

*Фота і тэкст А. ВАЛОШЫНА.*

# У КРАІ «САРАКА ЕНІСЕЯЎ»

ТУРЫСЦКІМІ МАРШРУТАМІ

ГЭТЫМ ЛЕТАМ група турыстаў-воднікаў НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі была ў падарожжы пятай катэгорыі складанасці па аднаму з прытокаў вялікай сібірскай ракі Енісея.

Енісей — самая шматводная рака Савецкага Саюза — бярэ свой пачатак у сярэдзіне Азіяцкага мацерыка — у Туве. Тува, або, як інакш яе называюць, краіна «сарака Енісеяў», стала адным з цэнтраў савецкага воднага турызму. Самымі папулярнымі рэкамі ў турыстаў з'яўляюцца Ка-Хем, Бій-Хем, Малы і Вялікі Енісей. Па адной з іх прайшоў наш маршрут.

Падарожжа ў цэнтр Азіяцкага мацерыка пачалося ў дзень адкрыцця XII Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў у Маскве. Мы змаглі паглядзець па тэлебачанню толькі ўрачыстае яго адкрыццё. Патрэбна было спяшацца ў аэрапорт да самалета, які вылятаў у Краснаярск. Калі праляталі над начной Масквой, нават з вышыні некалькіх кіламетраў мы ўбачылі шматкалярowасць фестывальных агнёў. Дзіўны наш век — не паспелі пакінуць Маскву, а ўжо апынуліся ў пасёлку Кунгуртук, у васьмі кіламетрах ад якога працякае Белатыг-Хем.

Тува знаходзіцца зусім у іншым часавым поясе ў параўнанні з БССР. Мясцовы час апярэджвае маскоўскі на 4 гадзіны. Тым больш дзіўна, што на наступны дзень усе восем чалавек прачнуліся ў 5 гадзін раніцы, тады, калі ў нас была гадзіна ночы. Вось вам цуд акліматызацыі!

Наш флот быў з двух катамаранаў — белага і блакітнага. І вось дзень старту: напярэдадні два тыдні падарожжа. Судны падхапіла рачная плынь. Першы дзень падарожжа заўсёды асабліва: прывыкаеш да судна, да новых таварышаў па экіпажу. Калі б не прыбярэжныя лістоўніцы і бачныя ўдалечыні горы, то можна было б падумаць, што мы дзе-небудзь у Беларусі.

Адной з задач нашага воднага падарожжа было правядзенне па заданню Міністэрства меліярацыі і воднай гаспадаркі СССР натурных выпрабаванняў новага партатыўнага вымяральніка хуткасці патоку вады «Нёман-03», аўтарамі распрацоўкі якога былі асобныя ўдзельнікі групы.

Перашкоды на рацэ размеркаваны нераўнамерна: каскады складаных парогаў раздзелены дзесяткамі кіламетраў параўнальна павольнай плыні. Шлях да гор, а гэта значыць да першых парогаў, заняў два дні. Першы каскад парогаў — Лесвіца — расчараваў нас: на рацэ быў высокі ўзровень вады і на месцы парогаў былі толькі пакатыя, метровай вышыні вадзяныя валы і рэдкія камяні. Затое тут былі злоўлены першыя харыусы. З гэтага часу мы рыбачылі кожны дзень. Самымі ўдачлівымі рыбакамі былі Лёня Васілевіч і Жора Шкляроўскі.

І вось напярэдадні Мельзейскі каскад — месца, добра знаёмае сярод турыстаў-воднікаў. У турысцкай літаратуры яму надаецца даволі шмат увагі як адной з самых сур'ёзных перашкод Малога Енісея. Каскад сустрэў нас дробным дажджом. Тут былі пераадолены першыя, не вельмі складаныя, слаламнага тыпу парогі. Але чым далей, тым больш сур'ёзнымі і складанымі станавіліся перашкоды. Праходжанне парогаў было добрым выпрабаваннем для нас і нашых суднаў.

Далей шлях ляжаў у Шчокі, або, як іх называюць яшчэ,— Ка-Хемская Труба. Месца гэта ўнікальнае і па прыгажосці, і па складанасці. Рака прарэзала вузкі глыбокі калідор у базальтавых скалах. Сціснутая імі, як у цісках, яна ўспенілася каскадам складанейшых парогаў, падрыхтаваўшы сур'ёзныя перашкоды.

За чарговым парогам — калідор спакойнай вады сярод прыгожа зрэзаных ветрам і вадою скал. І хаця, мяркуючы па лоцыі, усе парогі каскада ўжо пройдзены, у гэта чамусьці не вельмі верылася. Напружанне знікла толькі тады, калі за чарговым паваротам з'явілася высокая скала, на якой трапятаў сцяг. Гэта знаёмая ўсім нам па апісаннях і расказах стрэлка Ка-Хема, а значыць, і канец Шчок.

Маршрут завяршаўся. Гэта вызначалася не толькі тым, што ішла трэцяя сотня кіламетраў сплаву, але і нашым настроем: усё часцей узнікалі думкі пра родны дом. Мы і не заўважылі, як прайшлі моцныя Панфілаўскі, Васільеўскі, Байбальскі, а потым і фінішныя — Масква і Эржэй парогі. У пасёлку Эржэй закончылася водная частка нашага падарожжа.

Вось мы і вяртаемся дамоў. Гэты непаўторны край надоўга застанецца ў памяці. Хочацца спадзявацца, што падарожжа — не апошняя наша сустрэча з Тувай, краем, дзе цякуць такія рэкі, якія даюць пачатак магутнаму Енісею.

**Ф. ЕРМАЛІЦКІ,**
**супрацоўнік НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі.**



КАНФЕРЭНЦЫІ

# Бальшавіцкі друк

НА ФАКУЛЬТЭЦЕ ЖУРНАЛІСТЫКІ адбылася студэнцкая навукова-тэарэтычная канферэнцыя «Бальшавіцкі друк у гады першай расійскай рэвалюцыі (1905—1907 гг.)».

Васьмідзесяцігоддзе рэвалюцыі 1905—1907 гг. адзначаюць не толькі у СССР, але і за мяжой. Яркае сведчанне гэтага — актыўны ўдзел замежных студэнтаў у навуковай канферэнцыі.

Многія студэнты выступілі з цікавымі, змястоўнымі дакладамі. Сярод іх можна адзначыць даклад студэнта IV курса Эдгара Куао Зотці (Бенін) «Адлюстраванне падзей першай рускай рэвалюцыі на старонках замежнага друку» (навуковы кіраўнік дацэнт С. В. Говін).

У сваім выступленні «У. І. Ленін аб стратэгіі і тактыцы ў першай рускай рэвалюцыі (на прыкладах газет «Уперад», «Пралетарый», «Новае жыццё»)» студэнтка Т. Бялькевіч (навуковы кіраўнік прафесар Р. В. Булацкі) пазнаёміла слухачоў з тым, як бальшавіцкая прэса ў самыя цяжкія дні адстойвала інтарэсы працоўных.

Бальшавіцкі друк у перыяд першай рускай рэвалюцыі, падкрэслівалі дакладчыкі, быў сапраўднай трыбунай сацыял-дэмакратаў. У ім публікаваліся матэрыялы з усіх куткоў Расіі.

**Саду АБДУЛАЙ,**
студэнт факультэта журналістыкі.

**НА ЗДЫМКУ:** у час студэнцкай навуковай канферэнцыі.



# СПРАВАЗДАЧА «СЛОВАЗНАЎЦАЎ»

СЕЛЕТА па рашэнню ЮНЕСКА ва ўсім свеце адзначаецца 800-годдзе велічнага помніка ўсходнеславянскага пісьменства «Слова аб палку Ігаравым». Нядаўна кафедра беларускай літаратуры правяла універсітэцкую навуковую канферэнцыю, прысвечаную гэтай падзеі.

Канферэнцыю ўступным словам адкрыў рэктар універсітэта акадэмік АН БССР Л. І. Кісялёўскі, які падкрэсліў непераходзячае значэнне «Слова» для культуры не толькі ўсходніх славян, але і ўсёй еўрапейскай культуры, паставіў твор у шэраг выдатнейшых эпічных шэдэўраў сусветнай літаратуры. Затым выступілі вучоныя БДУ імя У. І. Леніна, Акадэміі навук БССР, Мінскага інстытута культуры, Брэсцкага педінстытута імя А. С. Пушкіна.

Доктары філалагічных навук А. А. Лойка, М. М. Грынчык, Л. М. Шакун гаварылі пра традыцыі «Слова» ў старабеларускай літаратуры, народна-фальклорныя вытокі вобразнасці твора, пра яго як крыніцу гісторыі моўнай культуры ўсходніх славян. В. А. Чамярыцкі праясніў некаторыя так званыя цьмяныя мясціны «Слова». Тыпалагічнае падабенства паэм Янкі Купалы да помніка старажытнасці ў паказе гераічнага ўбачыў Г. М. Праневіч. «Да аналізу ідэйнага зместу «Слова аб палку Ігаравым»— такую назву меў даклад А. А. Шалемавай. Нямала новага і цікавага было і ў дакладах універсітэцкіх моваазнаўцаў В. П. Красней, У. М. Лазоўскага і Я. М. Трэмбавольскага, якія закранулі прыроду моўнавыяўленчых сродкаў твора, выражэнне ў ім супрацьлеглых панацыяў лексічнымі сродкамі, сутнасць тэрміну «слова» як у ім самім, так і ў старажытнаславянскай літаратуры наогул.

**В. КАЧАНОВІЧ.**

НАШЫ ІНТЭРВ'Ю

# СПАРТЫЎНЫЯ ЗДАБЫТКІ І ЗДАРОЎЕ

**Немагчыма ўявіць жыццё сучаснага чалавека без заняткаў фізічнай культурай. Асабліва студэнта. Добрую палову дня яго займаюць заняткі, другую — бібліятэка, тэатр, кіно і г. д. Адным словам, па сваіму жаданню ці не, але студэнту прыходзіцца весці пасіўны ў адносінах да фізічных нагрузак лад жыцця. Таму, зразумела, кожная магчымасць атрымаць зарад бадзёрасці і энергіі павінна быць выкарыстана. На гэта накіравана работа універсітэцкага спартыўнага клуба. З яго кіраўніком А. С. БАЛДЗІНЫМ наша размова.**

**— Анатоль Сяргеевіч, скажыце, калі ласка, чым быў знамянальны мінулы год?**

— Па першае, сваёй шчодрасцю на спартыўныя дасягненні. Выхаванцы Белдзяржуніверсітэта не толькі паспяхова выступалі на рознага ўзроўню спаборніцтвах, але і станавіліся прызёрамі. Варта прыгадаць бліскучыя перамогі на барцоўскім дыване студэнта юрыдычнага факультэта Камандара Маджыдава, які ў гэтым годзе атрымаў ганаровае званне заслужанага майстра спорту. Гэтакі ж тытул маюць сёння гімнастка Вольга Кісялёва і баскетбалістка Галіна Савіцкая — студэнткі факультэта журналістыкі.

Па-другое, прыемна адзначыць, што павялічылася колькасць студэнтаў, супрацоўнікаў і выкладчыкаў універсітэта, якія рэгулярна займаюцца ў секцыях ці проста карыстаюцца паслугамі спартыўных залаў.

**— Ці ёсць у гэтым заслуга спартыўнага клуба?**

— Натуральна. Асабліва актывізавалася наша работа пасля Пастановы партыі і ўрада «Аб паляпшэнні дзейнасці клубных устаноў і спартыўных збудаванняў». Сабе ў актыў мы сёння можам запісаць 5 створаных спартыўных клубаў: рытмічнай гімнастыкі, аматараў бегу, гіравога спорту, спартыўнага арыентавання і воднага турызму. Заняткі тут праходзяць з улікам магчымасцей наведвальнікаў. Адбыліся змены і ў раскладзе работы спартыўных залаў. Гэта значыць, што павялічыўся час выкарыстання іх супрацоўнікамі і выкладчыкамі універсітэта. Прычым спортзалы працуюць без выхадных. Шырэй сталі практыкавацца такія студэнцкія мерапрыемствы, як: «Усёй групай — на стадыён», «Дні здароўя», «Тыдзень бегуна», «Тыдзень лыжніка» і інш.

**— Ці садзейнічалі апошнія меры яшчэ большай папулярызацыі фізічнай культуры сярод студэнтаў?**

— Безумоўна. Хаця і сцвярджаюць, што мова лічбаў не самая красамоўная, аднак найбольш пераканаўчая. Таму дазволю сабе прыгадаць некаторыя статыстычныя даныя. Так, за мінулы навучальны год значкістамі ГПА сталі 2350 чалавек, падрыхтавана 1100 суддзяў па спорту, 5500 студэнтаў займаюцца ў секцыях, 20 сталі кандыдатамі ў майстры спорту, 10—майстрамі спорту, каля 500—спартсменамі-разраднікамі, 90—выканалі нарматывы першага разраду, 630 чалавек адпачылі летам у аздараўленчым спартыўным лагеры на возеры Нарач.

**— Аднак не толькі ў гэтым заключалася работа клуба?**

— Яшчэ адзін клопат першаступеннай важнасці — арганізацыя актыўнага ладу жыцця ў адносінах да спорту з боку жыхароў інтэрнатаў. Асаблівую важнасць гэта атрымала пасля прыняцця закона «Аб мерах па пераадоленню п'янства і алкагалізму». Вельмі важна, каб у вольным часе студэнтаў не ўтвараўся так званы вакуум, які, бывае, нечым запоўніць. У кожным інтэрнаце створаны спартыўны пакой, арганізуюцца разнастайныя масавыя спартыўныя гульні. Прычым адпаведны інвентар і абсталяванне можна без цяжкасцей атрымаць на спартыўнай базе студэнцкага гарадка ці ўзяць напракат у прафкоме універсітэта. Узмацнілася прапаганда заняткаў спортам і адпаведна антыалкагольная. З гэтай нагоды хацелася б адзначыць фізічны, радыёфізічны, філалагічны факультэты.

**— Гэта з'яўляецца адным са складаемых спартыўна-масавай работы?**

— Так. І калі зайшла аб гэтым гаворка, давайце звернемся да табліцы, якая адлюстроўвае вынікі агульнауніверсітэцкага агляду конкурсу па спартыўна-масавай рабоце. Канчаткова факультэты размясціліся наступным чынам:

— радыёфізічны;
— юрыдычны;
— журналістыкі;
— геаграфічны;
— фізічны;
— філалагічны;
— біялагічны;
— прыкладной матэматыкі;
— хімічны;
— механіка-матэматычны;
— гістарычны.

**— Дагэтуль гаворка ішла выключна аб поспехах і дасягненнях. А ці ёсць праблемы ў работе спартыўнага клуба?**

— Было б дзіўна, калі б не было. Апошнія два гады універсітэт даволі адчувальна павялічыў прыём студэнтаў, а карысная плошча спартыўных памяшканняў засталася ранейшая. Увогуле спартыўная матэрыяльная база БДУ пакідае жадаць многа лепшага. Сумна, што флагман вышэйшай школы знаходзіцца ў ліку апошніх ВНУ рэспублікі па забеспячэнню спартыўным абсталяваннем і інвентаром. Праўда, у 1986 годзе плануецца закласці буйны спартыўны комплекс у студэнцкім гарадку па вуліцы Кастрычніцкай.

**— Якія будуць Вашы пажаданні студэнтам у новым годзе?**

— Множыць свае спартыўныя здабыткі, і самае галоўнае — здароўя!

Запісаў **В. МЫШАНЕЦ.**

РУЖОВЫ РАНАК
ЛІТАРАТУРНАЯ СТАРОНКА

# Радкі хвалявання і роздуму

1985 ГОД у сваім схілку парадаваў узлётаўцаў выхадам іх чарговай, пятай ужо, паэтычнай кнігі. Назва яе — «Вусны». У ёй прадстаўлены вершы больш чым дваццаці маладых паэтаў, дзевяцёра з якіх скончылі наш універсітэт летась — Валянціна Місюк, Сяргей Кавалёў, Леанід Трубач, Сяргей Чыгрын, Міхась Карпечанка, Ірына Сабачэўская, Таццяна Марчык, Вольга Савасцюк, Алена Забаронак... Гэта было моцнае ядро літаб'яднання, і тут можна было разгубіцца, а калі зноў падобнае ж папаўненне ўвальецца ў яго?..

Па вершах, якія сёння вам прапануюцца, можна ўбачыць, што цяпер лідзіруюць у нас трэцякурснікі — Жанна Пахадня, Галіна Ракоца, Алена Сторажава. Прыкметна выраслі за гады вучобы ва універсітэце як паэтэсы Таццяна Алешка і Наталля Кучмель, якія пішуць па-руску.

Знаёмства з першакурснікамі-пачаткоўцамі ў паззіі ў вас адбудзецца пакуль што толькі цераз вершы Марыі Арлукевіч і Андрэя Гуцава. Радкамі хваляванняў і роздуму ўвуляецца сёння ўсё тое, што пішуць студэнты-ўзлётаўцы.

А. ЛОЙКА,
кіраўнік
літаб'яднання
«Узлёт».

## Андрэй ГУЦАЎ

### САНЕТ

*Куды ні глянь — дамы, дамы,*
*І ўсюды камень, камень, камень...*
*А здрыганулся — прад вачамі*
*Зялёны луг і лес прамы,*
*Што стромка вырас пад грамы,*
*Махае ветліва рукамі*
*І быццам хоча над лугамі*
*Развеяць воблакі-дымы...*
*Мой родны кут, як ты далёкі,*
*А блізкі, быццам за два крокі,—*
*І калі мне не па сабе*
*І халады, нібы зімою,*
*Я знаю: думка аб табе*
*Разгоніць хмары нада мною!*

## Жанна ПАХАДНЯ

### ВІНА

*Мне абыякавасць*
*Лічаць віной;*
*Навошта спрачацца,*
*Раз бачаць такой?*
*Змаўчу на папрокі:*
*Ну, што адказаць?*
*Чужому, ды збоку,*
*Мо болей відаць...*
*Хай «шэрай» здаюся,*
*Ў «сяродцы» жыву,*
*Вышэй — навучуся,*
*Ніжэй — не магу!*

### ПРА РЭХА

Хрыпне рэха на лесвічнай клетцы:
— Вось пайду і не буду прасіць!..
(Штатнай сведцы — цікаўнай суседцы —
Новы выпадак блін прыпаліць).
Хрыпне рэха на лесвічнай клетцы...
Чамадан — вось упарты! — сцяной
Стаў на месцы... І як перанесці
Гэткі цяжар. І гэтакі боль?!

### АГОНЬ — ВАДА

Лёс адшукае паром
Там, дзе і броду няма;
Каханне мае — што агонь,
Вашая вернасць — вада!
Будзем — далонь аб далонь,
Іншае — прыйдзе пасля;
Слотаю вы мне, агонь,
Я вам спякотай, вада.
Вечар прыляжа на скронь —
Ранак па промню аддам:
Слотаю я вам, агонь,
Вы мне спякотай, вада!..

### НА РАЗВІТАННЕ

*Мы запрасілі ноч*
*На наш апошні чай:*
*Гарачы — цераз край —*
*І горкі — цераз край.*
*Мы запрасілі верш*
*На наш апошні чай:*
*Гаючы — цераз край,*
*Самотны, як «бывай!».*
*Наўрад ці будзе лепш?..*
*...Хтось пра ад'езд пачаў...*
*І ўжо ў душы — адчай*
*І пуста — цераз край!..*



Фота В. ШЫНКАРЭНКІ.

## Алесь БАДАК

* * *

Пабудзь са мною, адзінота,
Не дай забыць у тлуме дзён,
Што ёсць
Радзіма...
Каля плоту
Пасе свой цень
на градцы клён.
Нібы лісток забытай кніжкі,
Калыша вецер весніц рып.
Відаць, ужо паспелі вішні,
Як не ілгуць календары.
Пабудзь са мною, адзінота,
І на чужой, чужой зямлі
Не дай забыць мне
Басаногай
Рачулкі Ведзьмы...
Хай баліць
У маім сэрцы лесу гоман,
Святло дрыготкае расы
І слёзы маці.
Матчын голас,
Калі развітваўся з ёй сын.
І нас дарогі выбіраюць,
Не толькі мы бяздомных іх.
Не трэба ў сум.
Прашу — у радасць
Пабудзь са мною,
Хоць бы
Міг!..

* * *

Нечага не разумеем,
Нечага не заўважаем:
Пісаныя для бяссмерця,
Вершы ніхто не чытае.
Свет у палоне абновак.
Крэкча ад цяжару памяць.
Хвалім, узносячы многіх,
Цягнемся больш да Купалы.
Мір. Пралетарыі. Космас.
Бесперспектыўнае рабства...
Час наш, такі неспакойны,
Дай у табе разабрацца!..

## Марыя АРЛУКЕВІЧ

* * *

Я не хачу жыць толькі ў восені
І толькі жоўты ліст таптаць;
Я не хачу з нябес без просіні
Маўклівы сум дажджоў глытаць;
Я не хачу прастораў шэрасці,
Ялін насуплівасці злой,—
Усё ў мяне яшчэ ж наперадзе,
А нічагуткі за спіной!..

## Галіна РАКОЦА

* * *

Мера болю
Мерай радасці?
Мера нянавісці
Мерай любові?
...Агонь бенгальскі не заменіць зоркападу,
Як нельга замяніць ваду на кроў!

* * *

Душа адчайна прагне перамен,
Як слотай мкнуць блакіту вершавіны:
У дня — ночы прашу,
Ў начы — малю аб дні.
Клубок дарог.
Шукаю пуцявіны.
Душа ў грымотах прагне цішыні.
Хто крыліць мару — не баіцца краху.
Не падмяняю лёс свой а ні-ні
Застрахаваным лёсам у дзяржстраху.
Душа адчайна прагне вышыні.
Параніць боль — час мудры згоіць сэрца,—
У свеце жыць дабра высокай мерцы!

### ПРЫВІДНЫ ГОРАД

Прывідны горад...
Вецер
Сліны
Дамоў
Дугой
Выгінае.
Светафора налітае вока крывёй
Працінае.
Прывідны горад.
Адзіночкі і пары.
Час раптоўных спатканняў,
Час раптоўных аварый.
Якое ж ты, існаванне
У гэтым часе,
У гэтым горадзе?
Калі належыш
Смерці
І каханню —
Пораўну?!

## Алена СТОРАЖАВА

### ПАЦАЛУНАК ТВОЙ...

Пацалунак твой — як ратунак
У зорапад маіх мар і надзей...
Што мне людзі, каханы мой, любы?!
Я даўно не гляджу на людзей.
Што мне позірк абразлівы ў вочы,
Шэпт і смех за маёю спіной!!
...Пацалунак твой — як ратунак
Ад людзей, ад сябе самой.

* * *

Не прымушайце рэха паўтараць
Гукі стрэлаў
Далёкіх і блізкіх.
Рэха спіць
Над дзіцячай калыскай
І не хоча надрыўна крычаць.
Рэха песню падхопіць і смех,
У гаі адгукнецца зязюлі.
Сорак год мы не чулі вайны,
І дай бог, каб ніколі не чулі!

* * *

Над горадам смуга і смутак цішыні,
І восень — верны некалі дарадца —
Гандлюе золатам маёй душы.
А да душы ці ж можна дакранацца?
...Над горадам халодны вецер горкі.
Няма каго ў госці мне чакаць.
Крышыцца
лісце пад нагамі,
як асколкі
Душы,
якой без вас
не ўз'яднаць...

## Таццяна АЛЕШКА

*По одиночествам скользя,*
*Столкнуться с кем-нибудь нельзя.*
*И парк осенний вместо встреч*
*Уединенье стал беречь.*
*Он облетает, тихо тает,*
*Поспешно птицы улетают.*
*И каждый лист, как островок,*
*Необитаем, одинок.*
*Чем старше мы, тем отдалённей*
*И к невмешательству всё склонней.*
*И если рядом чей-то путь,—*
*Как трудно нам не проскользнуть.*

## Наталля КУЧМЕЛЬ

* * *

Поздней осенью, ночью промозгло-сырой
Рыжий лист боязливо мелькнул над землей,
Оторвался от ветки — качнулся — и стих.
Затаился в траве среди братьев своих.
А потом от него, как от рыжей звезды,
В черном воздухе долго светились следы.

* * *

Когда ты далеко, спокойно мне,
Не надо притворяться безразличной,
Не надо ощущать себя привычно
Виновною бог весть в какой вине;
Не надо заговаривать и ждать
Ответа с напряженными глазами
И там, где ты, неслышными шагами
Стараться незаметно пробежать;
Не надо думать, как сказать, как стать
И так ли платье облегает плечи...
Когда ты далеко — гораздо легче,
Но эту тяжесть горько потерять!..

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Красная звезда» МВПА імя Я. Коласа.
19 снежня 1985 г.
Зак. 3282. АТ 13894.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 72-73.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЕЎ.